

# ПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ ДА 2030 ГОДА І ФУНКЦЫЯНАВАННЕ НАВУКІ

**Пра што Прэзідэнту дакладвалі кіраўнікі Нацбанка і Акадэміі навук**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. ЧАЦВЕР № 210 (30598)

У пачатку лістапада беларуская грамадзянская авіяцыя адзначае свае прафесійнае свята. Гэта выдатная нагода зірнуць на адну з найбольш высокатэхналагічных, інавацыйных і навукаёмістых галін эканомікі, якая прадаўжае развівацца, мадэрнізавацца і заваёўваць давер пасажыраў па ўсім свеце.

СТАР. 12




# ПАЛЁТ — НАРМАЛЬНЫ!

**Нягледзячы на санкцыі і перашкоды, айчынная авіяцыя развіваецца, а бяспека пасажыраў застаецца адным з галоўных яе прыярытэтаў**

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ЧЫМ ЗНАКАМІТЫ ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК ОБАЛЬ?

15



**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

25210>

## PRO ЭКАНОМІКУ



## ЧЫТАЙЦЕ Ў СЁННЯШНІМ ВЫПУСКУ

- Рост цэн працягне запавольвацца? Адказвае эканаміст
- У чым перавага прадукцыі новага пакалення
- Ад ідэі да вытворчасці — у адной лакацыі
- Дадатковая пенсія — першыя пайшлі!
- «Адзін раён — адзін праект»: ёсць эфект

СТАР. 7–10

# ПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ І ФУНКЦЫЯНАВАННЕ

## Пра што Прэзідэнту дакладвалі старшыня Праўлення Нацыянальнага банка

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклады старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рамана Галоўчанкі і старшыні Прэзідыума Нацыянальнай Акадэміі навук Уладзіміра Караніка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.***



Цэнтральнай тэмай даклада кіраўніка Нацбанка стала дапрацоўка Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі да 2030 года. Раман Галоўчанка — кіраўнік створанай па распараджэнні Прэзідэнта рабочай групы, якая гэтым займаецца. Да 1 лістапада дапрацаваны дакумент павінен быць прадстаўлены кіраўніку дзяржавы. У сераду Прэзідэнт заслухаў даклад аб асноўным змесце праграмы, ключавых галінах і сферах, на якіх зроблены акцэнт. У канчатковым выглядзе дакумент плануецца вынесці на зацвярджэнне Усебеларускага народнага сходу, пасяджэнне якога пройдзе 18 і 19 снежня гэтага года.

Яшчэ адной тэмай даклада Рамана Галоўчанкі стала работа па практычнай рэалізацыі даручэнняў, дадзеных на нарадзе Прэзідэнта з апаратам Нацыянальнага банка і кіраўніцтвам банкаў, якая прайшла

### «КОЖНЫ БЕЛАРУС ПАВІНЕН РАЗУМЕЦЬ, ЯКОЙ БУДЗЕ КРАІНА ПРАЗ ПЯЦЬ ГАДОЎ»

У гутарцы з журналістамі Раман Галоўчанка адзначыў, што работа над праектам Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця выканана вялікая. «Трэба адзначыць, што ў дапрацоўцы Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця актыўна ўдзельнічаюць не толькі члены рабочай групы. Мы інтэгруем туды ўсе рацыянальныя прапановы, якія паступаюць ад іншых крыніц, — гэта і прапановы дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, і прапановы, якія паступілі ў рамках праекта «Народная пяцігодка». Усё, што можна адтуль узяць карыснае і надзённае, мы інтэгруем. Я далажыў Прэзідэнту аб структуры праграмы, аб тых прыярытэтах, якія мы прапануем закласці ў яе аснову, і пра тое, як будзе ацэньвацца выкананне, хто будзе адказваць за кожны канкрэтны кірунак, якія механізмы будуць выкарыстоўвацца для дасягнення праграмы», — расказаў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, праграма атрымалася дастаткова комплексная і вертыкалізаваная, у дакуменце ўсё ўзаемаўвязана. «Дакумент павінен адпавядаць праграмным дакументам найвышэйшага парадку — гэта і Нацыянальныя мэты ўстойлівага развіцця нашай краіны, і перадвыбарная праграма Прэзідэнта — усё павінна быць узаемаўвязана. І самае галоўнае — даступна і зразумела», — удакладніў кіраўнік Нацбанка.

Раман Галоўчанка зрабіў акцэнт на тым, што праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця як Праграма развіцця грамадства і дзяржавы павінна быць зразумелая не толькі для чыноўнікаў, адказных за яе выкананне, але і для ўсіх грамадзян. Кожны беларус павінен разумець, якой мы бачым краіну праз пяць гадоў.

Кіраўнік рабочай групы заўважыў, што прагназаванне сацыяльна-эканамічнага развіцця ўласціва ўсім дзяржавам, але ёсць спецыфіка. Дзесьці да гэтага падыходзяць больш агульна, у апісальнай форме расказваюць, якой кіраўніцтва бачыць краіну, — прадстаўляюць «бачанне». Ёсць падыходы больш дакладныя з лічбамі, канкрэтнымі індыкатарамі, задачамі. Напрыклад, Кітайская Народная Рэспубліка вельмі старанна і выверана падыходзіць да стварэння такіх дакументаў. Паводле слоў Рамана Галоўчанкі, беларускія спецыялісты выкарыстоўвалі і некаторыя напрацоўкі з кітайскага вопыту сістэмы сацыяльна-эканамічнага прагназавання развіцця краіны. «Мне здаецца, у нас атрымалася гэта зрабіць. Мы выразна абмалявалі механізмы, інструменты, задачы і індыкатары, па якіх будзем ацэньваць паспяховасць выканання той ці іншай задачы», — удакладніў ён.

Прэзідэнт, адпраўляючы праект праграмы на дапрацоўку, звяртаў увагу на тое, што яна павінна быць, па-першае, рэалістычная, па-другое, канкрэтная і, па-трэцяе, зразумелая. З патрабаванняў кіраўніка дзяржавы і зыходзілі. Раман Галоўчанка адзначыў, што пасля ўнясення дакумента на разгляд Прэзідэнта ў вызначаны тэрмін, работа над ім не скончыцца, яна будзе працягвацца аж да вынясення на УНС. «Яшчэ пройдзе абмеркаванне з дэлегацыямі ад рэгіёнаў, магчыма, яшчэ нейкі фармат будзе. Мы нацэленыя на тое, каб гэта праграма была даступная, зразумелая, канкрэтная, хочам, каб кожны чалавек у нашай краіне разумеў, якой краіна будзе праз 5 гадоў — у 2030 годзе», — адзначыў кіраўнік рабочай групы.

### ІНВЕСТЫЦЫЙНАЕ КРЭДЫТАВАННЕ РАСЦЕ, А ІНФЛЯЦЫЯ ЗАПАВОЛЬВАЕЦЦА

На нядаўняй нарадзе з апаратам Нацыянальнага банка і кіраўніцтвам банкаў Прэзідэнт арыентаваў банкі на фінансавую падтрымку эканомікі. Тады Аляксандр Лукашэнка паставіў задачы і па іншых кірунках. Ключавыя блокі — цэнавая стабільнасць, фінансавая стабільнасць, падтрымка эканомікі банкаўскай сістэмай, укараненне новых тэхналогій, лічбавізацыі банкаўскай сферы ў інтарэсах кліентаў. У сераду кіраўнік дзяржавы цікавіўся, якія яго даручэнні ўжо выкананы, над якімі работа яшчэ вядзецца.

«Што датычыцца рэсурснай падтрымкі эканомікі, то я праінфармаваў Прэзідэнта, што сёлета задача рэалізуецца даволі паспяхова — банкі за 9 месяцаў павялічылі аб'ём крэдытавання эканомікі на 14 %. Асабліва адзначу, што хуткімі тэмпамі расце інвестыцыйнае крэдытаванне. І гэта тэксама не само сабой узялося, гэта мэтанакіраваная палітыка Нацыянальнага банка менавіта па стымуляванні інвестыцыйнага крэдытавання. І на сёння за 9 месяцаў мы выдалі на 4,5 мільярда рублёў інвестыцыйных крэдытаў — гэта практычна на 60 % больш, чым летась. У прынцыпе, цяпер ліквіднасць у банкаўскай сістэме знаходзіцца на досыць добрым узроўні. Рэсурсная база складае больш за 150 мільярдаў рублёў, і банкаўская сістэма гатовая крэдытаваць па прымальных стаўках любыя праекты (натуральна акупныя), прапанаваныя рэальным сектарам эканомікі», — расказаў Раман Галоўчанка. Паводле яго слоў, Нацыянальны банк увёў спецыяльны нарматыў менавіта па стаўках на інвестыцыйныя крэдыты для таго, каб зрабіць іх больш даступнымі і прывабнымі.

«Мы не забываем пра крэдытаванне фізічных асоб, хоць прымалі некаторыя меры, каб «засушыць» неабумоўленае спажывецкае крэдытаванне, а акцэнт зрабілі на крэдытаванні набыцця тавараў айчыннай вытворчасці. І на сёння такіх крэдытаў выдадзена ўжо на суму больш за мільярд рублёў, што на 23 % больш, чым за 9 месяцаў мінулага года», — дадаў кіраўнік Нацбанка.



Што датычыцца інфляцыі, то Раман Галоўчанка адзначыў тэндэнцыю на запавольненне. У чэрвені гэта лічба раўнялася 7,4 %, у верасні гадавы прырост спажывецкіх цэн запаволіўся да 7,1 %. «Вядома, гэта крыху вышэй за нашу мэту — 5 %. Але тут сваю ролю адыгралі разавыя фактары. Гэта і рост цэн у вытворцаў, і пэўны перанос інфляцыі з нашага асноўнага эканамічнага партнёра, Расійскай Федэрацыі. Цяпер асноўным драйверам росту цэн з'яўляецца харчовая група тавараў, асабліва сезонныя агародніна і садавіна. Цэны на непрадуктовыя тавары растуць тэмпамі, якія істотна ніжэйшыя за пяціпрацэнтны парог. Вялікай рызыкі ўзмацнення інфляцыйных працэсаў не бачым. Больш за тое, так званая трэндавая інфляцыя, якая разлічваецца намі з дапамогай спецыяльных методык, ачышчаных ад нейкіх кан'юнктурных фактараў, цяпер знаходзіцца на ўзроўні 6 %. Я мяркую, што прыкладна на гэтым узроўні мы павінны выйсці да канца года», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Кіраўнік Нацбанка далажыў Прэзідэнту аб выпрацаваных рашэннях па праблемных пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Нацбанка. Грамадскі рэзананс выклікалі такія пытанні, як навязванне банкамі страхавых паслуг, неабгрунтаванае збіранне тых ці іншых камісійных узнагарод. Асабліва народ абураўся складанасцямі са здачай так званых старых долараў ЗША, што ўскладняла правядзенне валютна-абменных аперацый. Раман Галоўчанка адзначыў,







# КРАІНЫ ДА 2030 ГОДА НАВУКІ

## і старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук

ў сярэдзіне верасня. У прыватнасці, рэалізацыя задачы па большай уцягнутасці банкаўскай сістэмы ў эканамічнае развіццё краіны. Гэта і рэсурсная база, і пытанні інфляцыі.

Кіраўнік Нацбанка далажыў аб выпрацаваных рашэннях па праблемных пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Нацбанка. У прыватнасці, па тэмах, якія маюць грамадскі рэзананс, і па зваротах беларусаў.

што тыя пытанні, якія патрабавалі хуткага рэагавання, выкананыя. Некаторыя носяць больш доўгатэрміновы характар.

Раман Галоўчанка падкрэсліў, што пытанне аб навязванні страхавых паслуг не з'яўляецца для банкаўскай сферы сістэмным. «Гэта, магчыма, адзінкавыя факты альбо трактоўка з боку грамадзян тых паслуг, якія банкамі прапануюцца, — сказаў ён. — Мы не фіксуем масавых скаргаў або зваротаў ад грамадзян менавіта з гэтай нагоды, а работа банкаў і аналіз зваротаў грамадзян знаходзяцца ў нас на пастаянным кантролі. Мы бачым не толькі скаргі і звароты, якія паступаюць у Нацбанк, але і тыя звароты, якія накіроўваюцца непасрэдна ў камерцыйныя банкі. Мы іх таксама кантралюем, глядзім». Што датычыцца навязвання страхавых паслуг, Раман Галоўчанка заўважыў, што тут трэба дакладна дыферэнцыраваць менавіта навязванне ад банкаўскага маркетынгу. Напрыклад, калі чалавек прыходзіць аформіць крэдыт, яму могуць прапанаваць страхоўку як спадарожную паслугу, ад якой можна адмовіцца. Навязваннем можна лічыць, калі чалавека запэўніваюць, што застрахавацца можна толькі ў банку. Раман Галоўчанка падкрэсліў, што прапанова страхавых паслуг больш зроблена для зручнасці кліентаў банкаў. І гэту прапанову можна прыняць, а можна ад яе адмовіцца.

Па словах кіраўніка Нацбанка, цяпер людзі больш пытанняў задаюць аб кошце і апраўданасці тых ці іншых камісійных узнагароджанняў, якія спаганяюцца банкамі. Гэта пытанне падымалася і на нарадзе з кіраўніком дзяржавы. Па словах Рамана Галоўчанкі, работа над яго вырашэннем разгорнута вельмі сур'ёзная. Што датычыцца валютна-абменных аперацый, гэта пытанне раней ужо атрымала рашэнне — з 1 кастрычніка змякчылі патрабаванні да плацежаздольнасці банкнот. Іх прымаюць, нават калі валюта свеціцца ва ўльтрафіялеце.

### Ключавыя пытанні беларуска-казахстанскіх адносін

Тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Казахстана Касым-Жамартам Такаевым адбылася 29 кастрычніка, паведамляе БелТА.

Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі двухбаковы парадак дня. У прыватнасці, дамовіліся аб тым, што ўрадавая дэлегацыя Беларусі ў найбліжэйшы час здзейсніць візіт у Казахстан і ўнясе канкрэтныя прапановы па паглыбленні супрацоўніцтва. Былі абмеркаваны прэзідэнтамі і іншыя ключавыя пытанні і праекты беларуска-казахстанскіх адносін.

Аляксандр Лукашэнка і Касым-Жамарт Такаеў таксама закранулі ў размове міждзяржаўны парадак дня. У тым ліку — падрыхтоўку маючага адбыцца саміту АДКБ у Кыргызстане.



Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір Каранік далажыў кіраўніку дзяржавы аб ходзе падрыхтоўкі сустрэчы Прэзідэнта з навуковай грамадскасцю. Было падкрэслена, што навуковая сфера ў тым ліку павінна зрабіць свой значны ўнёсак у рэалізацыю задач па развіцці краіны ў будучай пяцігодцы. Акцэнт — на практыка-арыентаваныя распрацоўкі, узмацненне сувязі навукі і вытворчасці, імпартазамяшчэнне і нарошчванне экспартнага патэнцыялу, засваенне запатрабаваных у рэальным сектары інавацыйных кірункаў. Кіраўнік НАН таксама праінфармаваў Прэзідэнта аб канкрэтных праектах і напрацоўках, па тэматыцы якіх раней даваліся даручэнні кіраўніка дзяржавы.

### РАСЦЕ ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАДТРЫМКА НАВУКІ — УЗРАСТАЕ АДКАЗНАСЦЬ НАВУКОЎЦАЎ

Вялікая нарада Прэзідэнта Беларусі з навуковай грамадскасцю краіны будзе праведзена да канца 2025 года. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы, ужо вядзецца падрыхтоўка да гэтага маштабнага значнага мерапрыемства. Гэта будзе сустрэча не толькі з акадэмічнай навуковай грамадскасцю. Патрабаванне Прэзідэнта — каб гэта было з удзелам прадстаўнікоў вузаўскай, галіновай навукі, усіх прадстаўнікоў навуковай сферы.

«Мы павінны забяспечыць больш цесную інтэграцыю навукі і вытворчасці, навукі і адукацыі для таго, каб тэхналагічныя ланцужкі «ідэя — фундаментальнае даследаванне — прыкладныя даследаванні — укараненне», а таксама «адукацыя — навука — вытворчасць» працавалі найбольш эфектыўна. Паколькі патрабаванне цяперашняга часу — хуткае ўкараненне навуковых распрацовак у практыку, што дазваляе забяспечыць тэхналагічны суверэнітэт», — раскрыў некаторыя падрабязнасці Уладзімір Каранік у размове з журналістамі.



Нараду, якая мае адбыцца, кіраўнік НАН назваў знакавай падзеяй у развіцці навукі нашай краіны, паколькі за ўсе гады незалежнасці Беларусі навука знаходзілася пад пільнай увагай дзяржавы і гэтая тэндэнцыя захаваецца і надалей. «Калі паглядзець прагнозныя дакументы па бюджэце на наступны год, фінансаванне навуковай сферы плануецца павялічыць на 22 %. Калі паглядзець больш аддаленую перспектыву — на праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, — то ў найбліжэйшыя пяць гадоў плануецца павялічыць навукаёмістасць ВУП у два разы», — сказаў Уладзімір Каранік. Ён зрабіў акцэнт на тым, што такія сур'ёзныя меры падтрымкі патрабуюць ад навукоўцаў павышэння адказнасці, росту эфектыўнасці функцыянавання як сферы ў цэлым, сістэмы кіравання фінансаваннем, так і эфектыўнасці навуковых распрацовак. «Мы павінны імкнуцца атрымліваць новыя веды ў рамках фундаментальных даследаванняў. Але практыка-арыентаванасць, імпартазамяшчэнне, забеспячэнне тэхналагічнага суверэнітэту краіны — тое, на што нам неабходна зрабіць акцэнт. Гэта патрабаванне сённяшняга і, я ўпэўнены, заўтрашняга дня», — падкрэсліў кіраўнік НАН.



Паралельна з падрыхтоўкай да нарады вядзецца работа па ліквідацыі недахопаў у рабоце НАН, на якія раней звяртаў увагу Прэзідэнт. На некаторыя з іх указвала і рабочая група па аналізе дзейнасці НАН, створаная па даручэнні кіраўніка дзяржавы ў 2024 годзе. «У цесным кантакце з прадстаўнікамі рабочай групы, з Саветам Міністраў падрыхтаваны прапановы, якія датычацца ўдасканалення механізмаў фінансавання і павелічэння мер падтрымкі вучоных, па аптымізацыі структуры НАН», — расказаў старшыня Прэзідыума НАН. Гэтыя прапановы, паводле яго слоў, узгоднены з усімі зацікаўленымі і вынесены на ўзровень кіраўніка дзяржавы. Цяпер сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта праводзіцца іх дапрацоўка. «Мы вельмі спадзяёмся, што да вялікай нарады выйдзем ужо з гатовымі рашэннямі, каб і кіраўнік дзяржавы, і навуковая грамадскасць разумелі, куды будзе развівацца навука, якімі будуць кіраўніцкае ядро НАН і прыярытэтныя напрамкі, на што будзе зроблены акцэнт і з дапамогай якіх механізмаў эфектыўнасць работы НАН будзе павышана», — дадаў Уладзімір Каранік.

У цяперашні час Беларусь па навукаёмістасці ВУП (а яна ацэньваецца ў адносных лічбах, бо складаецца з розных крыніц фінансавання) займае другое месца ў СНД, на першым — Расія. Кіраўніком дзяржавы ставіцца задача гэты паказчык павялічваць, імкнуцца да найлепшых сусветных практык. Аднак, удакладніў Уладзімір Каранік, гэта не значыць, што ўсё вырашаецца толькі грашыма. Без стройнай сістэмы, якая будзе забяспечваць эфектыўнасць, выніковасць работы, толькі павелічэнне фінансавання не прывядзе да значных станоўчых зрухаў.

Прэзідэнт не раз выразна выказваў сваё патрабаванне — навукоўцы павінны разумець, што адказнасць за эфектыўнасць іх работы будзе ўзрастаць гэтак сама, як будзе ўзрастаць іх падтрымка з боку дзяржавы.

Падчас даклада Прэзідэнту размова ішла таксама аб канкрэтных кірунках дзейнасці НАН, якія шмат у чым супадаюць з прыярытэтнымі кірункамі навуковай дзейнасці, зацверджанымі ўказам кіраўніка дзяржавы. Акрамя таго, у развіццё нядаўняй нарады аб стане спраў і перспектывах Віцебскай вобласці ў размове з Прэзідэнтам абмяркоўваліся канкрэтныя праекты ў аграпрамысловым комплексе (АПК) гэтага рэгіёна. Акцэнт быў зроблены на тым, што навука не павінна заставацца ўбаку ад развіцця АПК не толькі Віцебскай вобласці, але і краіны ў цэлым.



«Улічваючы, што на Віцебшчыне ёсць гаспадаркі, якія кіруюцца НАН, было ўказана на тое, што неабходна, каб яны сталі прыкладамі, флагманамі Віцебскай вобласці і каб мы адпрацоўвалі там новыя перадавыя распрацоўкі, — акрэсліў кіраўнік НАН ключавыя патрабаванні кіраўніка дзяржавы. — Было пазначана, што не варта абмяжоўвацца толькі гэтымі гаспадаркамі. Мы максімальна аператыўна павінны ўкараняць распрацоўкі ва ўсіх прадстаўнікоў АПК краіны».

Размова вялася і па канкрэтных праектах, па якіх Прэзідэнт даваў даручэнні. Гэта, у прыватнасці, праекты ў сферы ЗВЧ-электронікі і лазернай тэхнікі. «Мы падрабязна абмяркоўвалі, што неабходна яшчэ зрабіць для таго, каб гэтыя канкрэтныя навуковыя распрацоўкі і прататыпы як мага хутчэй набылі выгляд серыйных узораў і маглі маштабавацца, выкарыстоўвацца ў розных сферах дзейнасці нашай дзяржавы», — расказаў Уладзімір Каранік.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Гомельский завод пусковых двигателей имени П. К. Пономаренко», Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, д. 150 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/21, 150/22, 150В, 150, 150/20

**Здание заправочной склада ГСМ** с инв. № 350/С-204136, общ. пл. 35,5 кв. м, **открытый склад металла** с инв. № 350/С-204137, общ. пл. 3 203,7 кв. м, **склад лакокрасок, ГСМ** с инв. № 350/С-210707, общ. пл. 186 кв. м, **автомобильная дорога на территории** с инв. № 350/С-209431, общ. пл. 40 кв. м, **ангар участка нестандартного оборудования** с инв. № 350/С-206388, общ. пл. 369,1 кв. м.
**Сведения о земельных участках: 3 участка** предоставлены на праве постоянного пользования: **1** – общ. пл. 0,8037 га, **2** – общ. пл. 0,0262 га, **3** – общ. пл. 0,4458 га.

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1 542 408,00 бел. руб.** (снижена на 30 %)

**Лот № 2**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/17, 150/16, 150

**Здание специализированное обрабатывающей промышленности (участок механической обработки)** с инв. № 350/С-167815, общ. пл. 837,1 кв. м, **цех безрельсового транспорта** с инв. № 350/С-75350, общ. пл. 569,8 кв. м, **автомобильная дорога на территории** с инв. № 350/С-209428, общ. пл. 93 кв. м.
**Сведения о земельных участках: 2 участка** предоставлены на праве постоянного пользования: **1** – общ. пл. 0,6481 га, **2** – общ. пл. 0,0864 га.

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 1 213 722,70 бел. руб.** (снижена на 15 %)

**Лот № 3**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150, 150/16, 150-1

**Корпус опытно-промышленного производства сорбентов** с инв. № 350/С-107542, общ. пл. 2311,3 кв. м, **Автостоянка № 2** с инв. № 350/С-107541, общ. пл. 1812 кв. м, **Зарядная станция** с инв. № 350/С-56078, общ. пл. 172 кв. м. **Помещение транспортного назначения** с инв. № 350/D-182492, общ. пл. 294,9 кв. м.
**Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,4858 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания корпуса опытно-промышленного производства сорбентов с прилегающими боксами, зарядной станцией, автостоянкой.

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 811 995,99 бел. руб.** (снижена на 10 %)

Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с (BYN) BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после проведения аукциона.

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену.

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** от цены продажи лотов №№ 1-2, **3 %** от цены продажи лотов № 3 в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.10.2025.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 10.11.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов.

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **06.11.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 29 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**РУП «Институт почвоведения и агрохимии»**
на праве хозяйственного ведения (Продавец).

**Электронные торги состоятся 01.12.2025.**

**Лот № 1:** ФОЛЬКСВАГЕН ПАССАТ В6,
кузов (рама) № WVWZZZ3CZ7E246911, 2007 г. в.

Начальная цена с НДС 20 % – 9 700,27 руб.

Место нахождение: г. Минск, ул. Казинца, 90.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

АКЦЭНТЫ

# РЭЗЕРВЫ РАЗВІЦЦЯ

## Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН наведаў з рабочым візітам Санкт-Пецярбург

У паўночнай расійскай сталіцы Аляксандр Турчын прыняў удзел у 15-м пасяджэнні Савета дзелавога супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Санкт-Пецярбурга. Адбылася таксама цырымонія закладкі капсулы на пляцоўцы будаўніцтва Цэнтра беларускай тэхнікі. Акрамя таго, у праграме візіту — наведванне патрыятычнага аб'яднання «Ленрэзерв», якому перададзена памятная кніга пра генацыд беларускага народа, выпушчаная па матэрыялах расследавання Генпракуратуры Беларусі.



Фота БелТА.

У «Смольным» прайшло пасяджэнне Савета дзелавога супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Санкт-Пецярбурга, падчас якога Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр Турчын адзначыў выніковасць падобнага ўзаемадзеяння.

Паводле яго слоў, за пяць гадоў узаемны тавараабарот прамысловых тавараў павялічыўся больш чым у тры разы.

— Ёмістасць рынку Санкт-Пецярбурга і прапановы, якія пастаянна пашыраюцца з беларускага боку, дазваляюць падтрымліваць дынаміку росту паставак беларускіх прамысловых тавараў, — адзначыў Прэм'ер-міністр.

У якасці асноўных кірункаў, якія дазволяць беларускім вытворцам быць яшчэ больш прывабнымі для партнёраў з Санкт-Пецярбурга, ён агучыў наступнае:

— Сёння дадзены старт будаўніцтву Цэнтра беларускай тэхнікі. Задача — стаць дадатковым драйверам росту паставак беларускай тэхнікі. Нам трэба прыкласці ўсе намаганні, каб пабудаваць цэнтр у максімальна сціснутыя тэрміны.

У ліку прывабных Аляксандр Турчын вылучыў і стварэнне зборачных вытворчасцяў тэхнікі на тэрыторыі горада (такіх беларускіх вытворцаў, як «Пожснаб», «Белкамунмаш» і іншых). На яго думку, заключэнне доўгатэрміновых кантрактаў таксама можа стаць драйверам далейшага развіцця ўзаемадзеяння.

Аляксандр Турчын пазначыў перспектыўныя кірункі развіцця супрацоўніцтва Беларусі і Санкт-Пецярбурга.

Ён нагадаў, што беларускае харчаванне карыстаецца попытам у Расіі і з'яўляецца адным з асноўных артыкулаў экспарту. Паколькі Санкт-Пецярбург мае развіты транспартна-лагістычны складнік, ён выступае своеасаблівай артэрыяй для пастаўкі беларускіх прадуктаў харчавання ў іншыя расійскія рэгіёны.

— Гэта выгадна нам, гэта выгадна і Санкт-Пецярбургу, — падкрэсліў Аляксандр Турчын.

Гаворачы аб лагістыцы, ён адзначыў, што важным для абодвух бакоў з'яўляецца праект аснашчэння беларускага грузавога тэрмінала ў порце Бронка.

— Ідзе рост перавалкі грузаў, і таму па меры аснашчэння да 20 мільёнаў тон у год будзе аб'ём перавалкі. Роля Санкт-Пецярбурга ў нашай лагістыцы для нашай краіны будзе толькі ўзрастаць, — канстатаваў Прэм'ер-міністр.

У ліку перспектыўных кірункаў ён таксама адзначыў медыцыну і фармацэўтыку.

У тэму

## У САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ ДАДЗЕНЫ СТАРТ БУДАЎНІЦТВУ ЦЭНТРА БЕЛАРУСКАЙ ТЭХНІКІ

**Ва ўрачыстай цырымоніі закладкі капсулы прыняў удзел Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН, паведамляе БелТА.**




Фота БелТА.

Дзякуючы мультыбрэндавай пляцоўцы Беларусь плануе павысіць эфектыўнасць прасоўвання беларускай тэхнікі на расійскім рынку.

— Санкт-Пецярбург знаходзіцца ў авангардзе нашых намаганняў па выбудоўванні комплексных ланцужкоў тавараправоднай сеткі беларускай прадукцыі не толькі на тэрыторыі горада, але і далёка за яго межамі. Акрамя высокай ёмістасці рынку, Санкт-Пецярбург валодае значнымі транспартна-лагістычнымі магчымасцямі. Пастаўкі сюды прадукцыі, у першую чаргу прамысловай, захоўваючы сваю актуальнасць, паступова падмацоўваюцца стварэннем высокатэхналагічных зборачных вытворчасцяў, — сказаў Аляксандр Турчын.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што Беларусь і Санкт-Пецярбург працяглы час развіваюць стратэгічнае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Бакі пастаянна працуюць над пошукам новых форм узаемадзеяння. Стварэнне мультыбрэндавага Цэнтра беларускай тэхнікі — лагічны працяг сумеснай працы. Гэта першы аб'ект падобнага ўзроўню на тэрыторыі Паўночна-Заходняй акругі Расійскай Федэрацыі.

— Мы прынялі рашэнне пайсці на гэты крок, таму што перакананыя ў значным патэнцыяле развіцця Санкт-Пецярбурга як аднаго з найбольш магутных цэнтраў прыцягнення на еўразійскім кантыненце. Пра гэта сведчыць міжнародная форум-выстаўка «Расійскі прамысловец — 2025», якая адкрылася сёння. Праект быў бы немагчымы без даверных і адкрытых адносін, якія склаліся паміж Беларуссю і кіраўніцтвам горада, асабіста з губернатарам, — адзначыў Аляксандр Турчын.

Прэм'ер-міністр дадаў, што на нядаўняй сустрэчы Прэзідэнта Беларусі з губернатарам Санкт-Пецярбурга Аляксандрам Бягловым двухбаковае супрацоўніцтва названа прыярытэтным.

— Упэўнены, што сумесныя намаганні яшчэ не раз будуць дэманстраваць высокія вынікі і зробяць істотны ўнёсак у развіццё нашых адносін, — сказаў кіраўнік беларускага ўрада.

# «БЕЛАРУСЬ ЗАЎСЁДЫ БЫЛА І БУДЗЕ ДОНАРАМ БЯСПЕКІ Ў ЕЎРАЗІЙСКІМ РЭГІЁНЕ»

**Эксперты — аб моцным, як заўсёды, мудрым выступленні Прэзідэнта і ролі нашай краіны ў міжнароднай архітэктуры бяспекі**

Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на адкрыцці ІІІ Мінскай міжнароднай канферэнцыі па еўразійскай бяспецы стала цэнтральнай падзеяй гэтага маштабнага форуму і задало тон усёй наступнай працы. Эксперты — аб стратэгічна выверaным і своечасовым бачанні кіраўніком дзяржавы шляхоў пераадолення крызісу ў міжнароднай архітэктуры бяспекі.



Фота БелТА

## «НАС НЕ ЧУЕ ТОЛЬКІ ЗАХАД»

Нагадаем, што сярод удзельнікаў форуму — прадстаўнікі больш як 40 дзяржаў і 7 міжнародных арганізацый, у тым ліку міністры замежных спраў, кіраўнікі інтэграцыйных аб'яднанняў, парламентарыі, аналітыкі і эксперты з Беларусі, Аўстрыі, Азербайджана, Арменіі, В'етнама, Вялікабрытаніі, Казахстана, Кітая, Індыі, Расіі, Італіі, Іспаніі, Сербіі, ЗША, Швейцарыі, Швецыі, Фінляндыі, Узбекістана і іншых краін.



**Дэкан факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ** у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» падкрэсліў, што да цяперашняй канферэнцыі праводзіліся іншыя форумы падобнага ўзроўню з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і высокіх прадстаўнікоў многіх дзяржаў.

— Гэта паслядоўнасць падзей кажа аб сур'ёзнай сістэмнай рабоце — як з боку Беларусі, так і з боку міжнароднай супольнасці, прадстаўнікоў якой мы рады бачыць на нашай пляцоўцы. Гэта паказчык нашага паслядоўнага курсу на наладжванне сапраўднага дыялогу і аднаўленне добрасуседскіх адносін, — дадаў госць праграмы.

Як адзначыў Аляксей Бяляеў, Беларусь заўсёды была і будзе донарам бяспекі ў Еўразійскім рэгіёне. А гэта канферэнцыя, адзначыў ён, — адна з ключавых для Беларусі міжнародных падзей.

ІІІ Мінская міжнародная канферэнцыя па еўразійскай бяспецы паказвае, што свет чуе Беларусь, падкрэсліў эксперт:

— Нас не чуе толькі Захад! Але гэты самы Захад, на шчасце, сёння не складае большасці насельніцтва Зямлі. Гэта і ёсць той самы «залаты мільярд» з 8 мільярдаў, якія насяляюць планету.

Эксперт падкрэсліў, што Аляксандра Лукашэнку на канферэнцыі слухалі вельмі ўважліва:

— Побач са мной сядзела шмат замежных прадстаўнікоў, якія запісвалі тэзісы Прэзідэнта. У некаторых месцах падчас выступлення кіраўніка дзяржавы нават апладзіравалі, хоць на канферэнцыях падобнага ўзроўню, дзе ідзе сур'ёзная аналітычная размова, апладысменты, у прынцыпе, непрымальныя. То-бок гэта не нейкія пафасныя з'езды, не ўрачыстыя мерапрыемствы, гэта насамрэч рабочая дзелавая размова. І гэта проста дзіўна, што падчас рабочай дзелавой размовы па вельмі сур'ёзных і часам, скажам прама, страшных пытаннях (таму што наш Прэзідэнт казаў пра тое, што свет сёння стаіць на парозе рэальнай ядзернай катастрофы, ідуць ваенныя канфлікты) прадстаўнікі іншых краін слухалі з вялікім натхненнем. Гэта значыць, аўдыторыя сапраўды сабралася тая, якая падзяляе агульныя пасылы. Але пры гэтым у кожнага, вядома ж, ёсць сваё меркаванне.

Аляксей Бяляеў падкрэсліў, што беларусы ніколі нікому не адмаўлялі ў праве выказацца, магчымасці агучыць свой пункт гледжання, як гэта прынята на Захадзе:

— Таму прамова Прэзідэнта па сваёй танальнасці была накіраваная нашым апанентам. І ўсе, хто сабраліся ў зале, — нашы аднадумцы, якія падзяляюць асцярогі Аляксандра Лукашэнкі і падзяляюць яго пункт гледжання. І адначасова падтрымліваюць яго канкрэтныя прапановы, як нам адысці ад гэтай бездані.

## «ЛЮДЗІ ПА ЎСЁЙ ПЛАНЕЦЕ ХОЧУЦЬ МІРУ»

У сваім магутным і, як заўсёды, мудрым выступленні Прэзідэнт пазначыў ключавыя прапановы краіны па мірным парадку дня, а менавіта: прадукты харчавання і лекі павінны быць па-за санкцыямі, крытычная міжнародная інфраструктура павінна быць пад надзейнай абаронай і пад міжнароднымі гарантыямі бяспекі. Важна пераадолець міграцыйны крызіс, і тут Беларусь заўсёды гатова да супрацоўніцтва. Таксама неабходны меры кантролю ў галіне штучнага інтэлекту, бо гонка тэхналогій ператварае штучны інтэлект у сапраўдную зброю — у сувязі з гэтым наша краіна прапануе стварыць пояс лічбавага добрасуседства.

— У кожнай з прапаноў па мірным парадку дня — перажыванне за лёс, бяспеку нашага агульнага дома, і не толькі Еўразіі, але ў цэлым усёй планеты, а таксама імкненне да ўмацавання міжнароднай стабільнасці і прадухілення новых канфліктаў, — звярнула ўвагу **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ала СМАЛЯК**. — Агульны пасыл выступлення нашага лідара — гэта заклік да адказнасці і сумеснай пабудовы будучыні на падмурку павагі, даверу, дыялогу і супрацоўніцтва. І трэба падкрэсліць, што такая пазіцыя кіраўніка дзяржавы, нашай краіны падтрымліваецца многімі разважнымі палітыкамі ва ўсім свеце, многімі дзяржавамі. Толькі заходнія палітыкі, як дакладна ўказаў Аляксандр Лукашэнка, дагэтуль жывуць ва ўпэўненасці, што «сілай могуць прымусіць усіх прытрымлівацца сваіх інтарэсаў». Пара ім усвядоміць: не прымусяць! Больш за тое, іх інструменты ў выглядзе незаконных санкцый, узвядзення бар'ераў, закрыцця граніцы — зброя супраць сябе саміх жа, прамая дарога да самаізаляцыі ад свету. Глабальная большасць — за здаровы сэнс у вырашэнні міжнародных праблем. І як падкрэсліў наш Прэзідэнт, краіны Еўразіі і глабальнай большасці сапраўды могуць многае зрабіць у гэтым кірунку, важна толькі аб'ядноўвацца ў адстойванні агульных інтарэсаў.



**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Вадзім ГІГІН** канстатаваў, што ў ёмістым выступленні Прэзідэнта — сумленны аналіз рэальнага стану рэчаў у свеце: ад разбору бягучай сітуацыі з закрыццём Літвой граніцы з Беларуссю (на злобу дня) да выразна сфармуляваных прынцыпаў дээскалацыі міжнароднай абстаноўкі.



— Гэта пазіцыя лідара незалежнай і суверэннай дзяржавы, упэўненай у сваіх сілах і перакананай у сваёй праваце, — падкрэслівае дэпутат. — Такая перакананасць абапіраецца на здаровы сэнс і разуменне таго, што людзі па ўсёй планеце хочуць міру. Мы даказалі, што можам сябе абараніць, не пойдзем ні на якія саступкі пад ціскам. Але мы гатовыя весці дыялог, бо толькі так і можна знайсці дарогу да міру. Захаду зроблена канкрэтная прапанова: давайце сумесна вырашаць наспелыя праблемы, а не займацца нагнятаннем напружанасці і гонкай узбраенняў.

Парламентарый звярнуў увагу на яшчэ вельмі важную частку выступлення:

— Мала казаць пра шматпалярны свет, пра тое, што мы супраць санкцый, супраць ціску з боку Захаду. Патрэбныя канкрэтныя справы, дзеянні. А гэта азначае, што важна дэманстраваць салідарнасць на міжнароднай арэне, актыўна фарміраваць новае, больш справядлівае светаўладкаванне.

## ВЫБАР «ЭСКАЛАЦЫЯ АБО РАЗРАДКА» ДЛЯ МІНСКА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВІДАВОЧНЫМ

Мы па-ранейшаму працягваем заходнім візаві руку для дыялогу, але гэта зусім не рука таго, хто просіць, дапаўняе **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Аляксандр ШПАКОЎСКІ**:



— Выбар «эскалацыя або разрадка» для Мінска з'яўляецца відавочным. Беларуская дзяржава цвёрда заяўляе аб неабходнасці дээскалацыі, зніжэння канфліктнасці і пераходу да мірнага суіснавання. Пры гэтым Беларусь гатова як дамагацца сваіх мэт палітыка-дыпламатычным шляхам, абапіраючыся на магчымасці саюзнікаў і пазіцыю дзяржаў глабальнай большасці, так і абараняць мір у нашай краіне ваеннымі сродкамі.

У гэтым выпадку гаворка ідзе пра вымушаную абарону, падкрэслівае парламентарый:

— Аднак Аляксандр Лукашэнка свядома нагадаў: дагавор аб гарантыях бяспекі паміж Беларуссю і Расіяй дазваляе нам выкарыстоўваць для абароны Саюзнай дзяржавы любыя інструменты, уключаючы ядзерную зброю.



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр КАРПІЦКІ** акцэнтуе ўвагу на тым, што курс на сілавы ціск і ўльтыматумы з боку Захаду даказаў сваю поўную беспадстаўнасць:

— У гэтай сітуацыі ініцыятыва Мінска па стварэнні прасторы для прамога і прафесійнага абмену думкамі без прадузятых ацэнак і ціску — гэта не проста дыпламатычнае мерапрыемства, а апошні жыццёвы арыенцір для сусветнай дыпламатыі, якая тоне.

На яго думку, асаблівую сілу выступленню Прэзідэнта надае яго прагматычная накіраванасць:

— Гаворка ідзе не пра імгненныя тактычныя выгады, а пра салідарнае будаўніцтва новай архітэктуры бяспекі, заснаванай на прынцыпах роўнасці, узаемнай павагі і непадзельнай бяспекі для ўсіх. Заклік Аляксандра Рыгоравіча адмовіцца ад стэрэатыпаў і думаць пра будучыя пакаленні — гэта тая аснова, якая дазваляе перайсці ад рыторыкі канфрантацыі да пошуку практычных пунктаў судакранання.

Парламентарый выказаў упэўненасць, што цяперашняя канферэнцыя стане важкім укладам у стабілізацыю абстаноўкі ў Еўразіі і за яе межамі:

— Яна наглядна дэманструе, што Беларусь, прытрымліваючыся курсу кіраўніка дзяржавы, не проста адаптуецца да змен, а актыўна фарміруе новую, больш справядлівую сістэму міжнародных адносін.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Сморгонский завод оптического станкостроения», Гродненская область, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, д. 80, корпус 25, офис 302. УНП 500154362 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет аукциона (одним лотом)**
Адрес: **Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, 80**

**Помещения административного корпуса 25** в составе: **административные помещения 30,5 кв. м** (443/D-11064), **1675,5 кв. м** (443/D-11065), **777,9 кв. м** (443/D-11066, составные части и принадлежности: подвал, покрытие 2212,9 кв. м, подъездной путь 231,2 кв. м, лестница 130,6 кв. м, подпорная стена 51,0 кв. м, покрытие из плитки 747,5 кв. м, ограждения 9,10 м и 9,0 м), **17,7 кв. м** (443/D-11069), **1880 кв. м** (443/D-11070), **2569,8 кв. м.** (443/D-11071); **ТП 75,2 кв. м** (443/D-11072); **конференц-зал 822,1 кв. м** (443/D-11067).
В состав лота входит **озеленение** (инв. № 2000078/12): многолетние насаждения (ель колючая голубая, 1 шт., туя западная, 14 шт., ива белая, 3 шт., дерен белый, 5 шт., арония черноплодная (живая изгородь) 187,0 м. п., дерен белый, спирея иволистная (живая изгородь) 95,0 м. п., туя западная, 2 шт., туя западная шаровидная, 3 шт., газон – 0,25 га)

***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. **1,0145** га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания здания административного корпуса 25. Ограничения (обременения): водоохранные зоны рек, водоемов; охранные зоны электрических сетей (пл. 0,0096 га).

***Обременения*:** в подвальном помещении здания расположено противорадиационное укрытие ПРУ, которое не входит в состав лота. После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута.

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 2 270 182 ,13 бел. руб.**
(снижена на 10 %)

**Задаток 2 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 30** рабочих дней после проведения аукциона.

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by). Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену.

Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 2 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.09.2025.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.11.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие принимаются по 13.11.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

ИНФОРМАЦИОННОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков **для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в деревне Яворовщина**
Пекалинского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **5 декабря 2025 года в 15.00,** дер. Пекалин, ул. Ленина, 34, Пекалинский сельисполком, зал заседаний |
| 3 | Продавец и его адрес | Пекалинский сельисполком, дер. Пекалин, ул. Ленина, 34 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1: площадь 0,1659 га, № 624883602101000084, дер. Яворовщина, ул. Берёзовая, 1А |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Вид права, целевое назначение земельного участка | Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земель для размещения объектов усадебной застройки) |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 10 000,00 рублей |

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета www.minsk-region.gov.by, Смолевичского районного исполнительного комитета https://smolevichi.gov.by/



# АСНОВА РАЗВІЦЦЯ ЭКАНОМІКІ

## Намеснік Прэм'ер-міністра Віктар КАРАНКЕВІЧ праінфармаваў парламентарыяў аб устойлівай рабоце прамысловага комплексу краіны ў гэтым годзе

Як было адзначана на сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, глабальнае палітычнае супрацьстаянне выразна дэманструе, што наяўнасць уласнай развітой індустрыяльнай базы — адзін са значных фактараў сацыяльнай эканамічнай стабільнасці, забеспячэння бяспекі і незалежнасці дзяржавы. Невыпадкова прамысловасць з'яўляецца ключавой галіной эканомікі Беларусі: яна фарміруе амаль трэцюю частку валавога ўнутранага прадукту, складае тры чвэрці экспарту.

### ВЫПУСК НОВАЙ ЗАПАТРАБАВАНАЙ ПРАДУКЦЫІ І РАЗВІЦЦЁ ЭКСПАРТНЫХ ПАСТАВАК



**Намеснік Прэм'ер-міністра Віктар КАРАНКЕВІЧ** праінфармаваў парламентарыяў аб забеспячэнні ўстойлівай работы прамысловага комплексу ў 2025 годзе.

Ён паведаміў, што па даных за 8 месяцаў прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ і паслуг у прамысловасці вырас у параўнанні з аналагічным перыядам 2024 года на 6,4 %, чысты прыбытак — на 11,1 % і дасягнуў амаль 7,1 мільярда рублёў, рэнтабельнасць продажаў у прамысловасці склала 9 %.

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што асноўная задача ў сённяшніх умовах — павышэнне эфектыўнасці работы прамысловасці і забеспячэнне яе збалансаванага росту. Для гэтага вызначаны некалькі кірункаў дзейнасці, па якіх арганізавана сістэмная работа.

Сярод іх ён вылучыў наступныя.

Першы — забеспячэнне росту аб'ёмаў прамысловай вытворчасці і выпуск новай запатрабаванай прадукцыі.

Цяпер Беларусь прымае ўдзел у рэалізацыі 80 праектаў па замяшчэнні імпарту прадукцыі айчыннымі таварамі, інтэграцыйныя праекты з Расійскай Федэрацыяй на агульную суму больш за 150 мільярдаў расійскіх рублёў. З удзелам кітайскіх партнёраў рэалізуецца каля 60 праектаў на агульную суму заяўленых інвестыцый каля 1,6 мільярда долараў.

Другі — стварэнне ўмоў па павелічэнні паставак прамысловай прадукцыі на ўнутраны рынак.

— У рамках існуючых механізмаў падтрымкі арганізавана работа па абнаўленні парка тэхнікі айчынных прадпрыемстваў, перш за ўсё нашым аграрыям. Дадаткова ўрадам прынята рашэнне аб падтрымцы рэалізацыі буйнагабарытнай сучаснай тэхнікі, выробленай на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, — паведаміў Віктар Каранкевіч.

Трэці — развіццё экспартных паставак.

— Арганізавана работа па максімальным выкарыстанні патэнцыялу краін СНД. Плануецца да канца года нарасціць станоўчую дынаміку экспартных паставак тавараў у краіны СНД за кошт выканання новых кантрактаў па пастаўках у Казахстан, Узбекістан, Азербайджан сельскагаспадарчай і грузавой тэхнікі вытворчасці МТЗ, Гомсельмаш, МАЗ, — адзначыў профільны віцэ-прэм'ер.



Ён дадаў, што нядрэнныя вынікі прыносіць узаемадзеянне з краінамі далёкай дугі: так, пастаўкі ў Афрыку растуць другі год запар. Экспарт прадукцыі машынабудавання на гэты кантынент вырас на 6,6 %, у прыватнасці, у 11,3 раза выраслі адгрузкі трактароў, у 4,7 раза — грузавых аўтамабіляў. У краіны Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі прыраслі ў 1,5 раза, Паўднёва-Усходняй Азіі — у 1,6 раза.

Для выбудоўвання доўгатэрміновага супрацоўніцтва ствараюцца сумесныя зборачныя вытворчасці. Сёлета адкрыты зборачныя вытворчасці трактароў ва Узбекістане і ліфтавага абсталявання ў Азербайджане. У Расіі ў гэтым годзе адкрыты мультыбрэндавыя цэнтры ў Разанскай і Арлоўскай абласцях, у Рэспубліцы Башкартастан і Прыморскім краі. Усяго на канец года ў Расіі будзе функцыянаваць 11 мультыбрэндавых цэнтраў.

— У сукупнасці пералічаныя сістэмныя меры ў большай ступені дазволілі зніверліраваць знешнія негатыўныя фактары і забяспечыць работу прамысловых арганізацый у штатным рэжыме, — адзначыў Віктар Каранкевіч.

Віцэ-прэм'ер праінфармаваў таксама аб найважнейшых задачах, якія стаяць перад лёгкай прамысловасцю, дрэваапрацоўкай, нафтахіміяй, энергетыкай і мерах, якія прымаюцца па іх вырашэнні.

### ШТО ХВАЛЮЕ ПАРЛАМЕНТАРЫЯЎ, А ЗНАЧЫЦЬ, НАСЕЛЬНІЦТВА?



У размове з журналістамі **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Надзея ЛАЗАРЭВІЧ** звярнула ўвагу на тое, што парламентарыі цікавілася развіццём прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, у цэлым перспектывамі галіны.

— Стаіць задача — выйсці на прыбытковую работу, павялічыць аб'ёмы вытворчасці і наменклатуру прадукцыі, — канкрэтызавала яна. — Будзем займацца імпартазамяшчэннем, мадэрнізацыяй нашых прамысловых прадпрыемстваў, знаходзіць новыя віды прадукцыі, якія прынясуць эканамічны эфект прадпрыемствам. На парадку дня — павышэнне тэхналагічнага патэнцыялу, каб больш хутка рэагаваць на просьбы, пажаданні нашых спажыўцоў, бо размова ідзе аб прадукцыі штодзённага карыстання. Самае галоўнае (на гэта сарыентаваў і кіраўнік дзяржавы) — трэба ўдзяліць увагу пытанню абароны ўнутранага рынку, непасрэдна нашых вытворцаў.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Дзяніс КАРАСЬ** адзначыў:



— Нягледзячы на знешнія выклікі, нашы прадпрыемствы працуюць. А гэта захаванне працоўных месцаў, выплата заработнай платы, падатковыя паступленні, развіццё кааперацыі паміж навукай і прамысловасцю, новая інавацыйная прадукцыя з высокай дабаўленай вартасцю.

Па словах парламентарыя, гэтыя пытанні заўсёды гучаць на месцах.

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Андрэй КРЫВАНОСАЎ** нагадаў, што кіраўнік дзяржавы ў свой час вызначыў шэсць умоў захавання суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны.



Самая галоўная з гэтых умоў — эканоміка, — падкрэсліў ён. — Прамысловасць, сувязь, транспарт — тэматыка, якая заўсёды хвалюе людзей. Узяць тую ж Гомельскую вобласць. Колькі мы чакалі Усходні абход (аб'язная дарога вакол Гомеля. — **«Зв.»**) — ён цяпер працуе. Што датычыцца прамысловых тавараў, усё ў нас сваё, лішняе прадаём у іншыя краіны. Гэта і ёсць мірнае суіснаванне.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

# ЭКСПАРТНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

## Важным партнёрам ЕАЭС з'яўляецца Манголія, з якой падпісана часовае гандлёвае пагадненне

**Яно замацоўвае прэферэнцыйны рэжым гандлю ў дачыненні да 367 таварных пазіцый ключавой экспартнай цікавасці кожнага боку, паведамілі ў прэс-службе Еўразійскай эканамічнай камісіі.**

Пагадненне з ЕАЭС Манголія заключыла на тэрмін тры гады з магчымасцю далейшага падаўжэння на трохгадовы перыяд па дамоўленасці бакоў.

Як растлумачыў **дырэктар дэпартамента гандлёвай палітыкі ЕЭК Уладзімір СЕРПІКАЎ**, пагадненне з Манголіяй з'яўляецца часовым. Яно вядзе да стварэння зоны свабоднага гандлю з абмежаваным ахопам лібералізацыі:

— Там у нас было па 367 таварных субпазіцый з кожнага боку. Але ўлічваючы структуру гандлю з Манголіяй, гэта тарыфная лібералізацыя ў рамках часовага пагаднення пакрывае практычна ўвесь наш гандлёвы абарот. Мы туды пастаўляем традыцыйныя тавары: абсталяванне, транспартныя сродкі, прадукцыю хімічнай прамысловасці, касметыку, парфумерыю. У частцы аграпрамысловага комплексу гэта таксама нашы традыцыйныя віды тавараў: розныя віды мяса, малочная прадукцыя, марожанае, кандытарскія вырабы. Таму з Манголіяй у нас практычна ўвесь наш гандаль будзе ахоплены тарыфнай лібералізацыяй у рамках гэтага пагаднення, што, вядома, стварае вялікія перспектывы для нашага экспарту.



# ПРАГРАМА «3+3»

## Амаль 63 тысячы работнікаў назапашваюць дадатковую пенсію з падтрымкай дзяржавы

**Першыя выплаты ў рамках праграмы «3+3» чакаюцца ў лістападзе-снежні гэтага года. Іх атрымаюць 47 чалавек (13 мужчын, 34 жанчыны), паведамілі ў Мінпрацы і сацабароны.**

У ведамстве патлумачылі, што гэта датычыцца грамадзян, якія за тры гады да агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту адны з першых уступілі ў праграму добраахвотнага страхавання з падтрымкай дзяржавы.

Нагадаем, што праграма пачала работу з 1 кастрычніка 2022 года.

Як атрымаць «другую» пенсію? Расказваем, як гэта зрабіць.

Спачатку трэба падаць заяву і заключыць дагавор са «Стравітай» непасрэдна ў страхоўшчыка або ў электронным выглядзе праз афіцыйны сайт. Затым — звярнуцца да наймальніка з копіяй дагавора і заявай аб пералічэнні адпаведнага страхавога ўзносу.

Уступаць у праграму страхавання «3+3» можна не пазней, чым за тры гады да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту.

Што далей?

Дадатковыя ўзносы на назапашвальную пенсію будуць штомесяц пералічвацца работадаўцам па заяве работніка. Дарэчы, можаце памяняць тарыф узносу на назапашвальную пенсію, але не часцей за 1 раз на год.

Работнік таксама мае права ў любы момант прыпыніць свой удзел у праграме і затым аднавіць выплату дадатковых узносаў.

Пры дасягненні агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту страхоўшчыкам работніку штомесяц будзе выплачвацца дадатковая назапашвальная пенсія на працягу 5 або 10 гадоў (па выбары грамадзяніна).



# ЦЭНЫ РАСТУЦЬ ПАВОЛЬНЕЙ

## Якой будзе інфляцыя ў Беларусі да канца года, ацаніла эканаміст

**Ва ўмовах запаволення інфляцыйных працэсаў, якія зафіксаваныя ў верасні 2025 года, беларуская эканоміка дэманструе важныя эканамічныя зрухі. Гадавы ўзровень інфляцыі апусціўся да 7,1 %, а зніжэнне коштаў на сезонныя харчовыя тавары выклікае надзею на стабілізацыю цэнавай сітуацыі. Разам з тым рост базавай інфляцыі і індэкс-дэфлятар ВУП паказваюць на ціск унутры эканомікі, які захоўваецца. Эканамічны эксперт, начальнік адукацыйнага цэнтра «Аксіёс» ААТ «Гіпрасувязь» Юлія АБУХОВІЧ дала ацэнку гэтым тэндэнцыям, прааналізавала прычыны бягучых змяненняў і падзялілася прагнозамі па інфляцыі да канца года, што асабліва важна для бізнесу і насельніцтва краіны.**

### ШТО ТАКОЕ ІНФЛЯЦЫЯ?

На нарадзе з кіраўнікамі банкаў 9 верасня кіраўнік дзяржавы запатрабаваў пераламаць у краіне тэндэнцыю росту інфляцыі. Цяпер прырост спажывецкіх цэн да ўзроўню ліпеня мінулага года ў гадавым выражэнні ўжо перавышае 7 % пры мэтавай задачы па абмежаванні інфляцыі ў гэтым годзе на ўзроўні, які не перавышае 5 %.

— Такі ўзровень у сярэднетэрміновай перспектыве ўяўляецца камфортным і аптымальным для беларускай эканомікі: ён дазваляе забяспечваць і рост даходнай часткі бюджэту, і збалансаванае ўнутранае развіццё, — адзначыла Юлія Абуховіч. — Зніжэнне індэкса спажывецкіх цэн у жніўні і верасні сведчыць аб змякчэнні інфляцыйнага ціску і наяўнасці перспектывы завяршыць гэты год з узроўнем інфляцыі, бліжэйшым да прагнознага.

Эксперт адзначыла, што індэкс спажывецкіх цэн, які агучваюць, кажучы пра інфляцыю, не адзіны яе індыкатар, ёсць яшчэ індэкс цэн вытворцаў і дэфлятар ВУП.

— У цэлым эканамічная карціна некалькі складанейшая, паколькі для ацэнкі характару інфляцыйных працэсаў варта ўлічваць таксама эканамічны рост, інвестыцыі і знешні гандаль, — звярнула яна ўвагу.

Індэкс цэн вытворцаў паказвае змяненне цэн на так званыя прамежкавыя тавары — сыравіна, матэрыялы і тавары на аптовым узроўні. Калі ў вытворцаў растуць выдаткі (на сыравіну, энергію, лагістыку), расце гэты індэкс. Гэта апераджальны індыкатар інфляцыі.



Індэкс спажывецкіх цэн дэманструе змяненне цэн на фіксаваны кошык тавараў і паслуг, які купляе сярэдняя хатняя гаспадарка (ежу, адзенне, транспарт, сувязь, камунальныя паслугі і г. д.), уключаючы імпартную прадукцыю. Рост гэтых цэн найбольш моцна адчуваюць людзі, таму нядзіўна, што індэкс спажывецкіх цэн стаў асноўным, базавым вымяральнікам інфляцыі ў краіне.

Нарэшце, дэфлятар ВУП — гэта самы шырокі паказчык інфляцыі. Ён вымярае змяненне цэн на ўсе тавары і паслугі, вырабленыя ўнутры краіны, і ўлічвае не толькі спажывецкія тавары, але і інвестыцыйныя (станкі, будынкі) і чысты экспарт.

— Працэс інфляцыі, гэта значыць, абясцэньванне грошай, які прыводзіць да павышэння цэн на большасць катэгорый прадукцыі, не абумоўленага паляпшэннем яе якасці, звычайна ідзе ў наступным парадку. Інфляцыя выдаткаў, выкліканая ростам сусветных цэн на сыравіну або ўнутраных выдаткаў, змушае вытворцаў падымаць цэны. Далей рознічныя сеткі і пастаўшчыкі паслуг закладваюць свае падрослыя выдаткі ў канчатковую цану для спажыўца, фарміруючы спажывецкую інфляцыю. Нарэшце, рост цэн ахоплівае ўсю эканоміку, і дэфлятар ВУП адлюстроўвае гэты агульны рост, — падкрэсліла эканаміст.

Інфляцыя можа суправаджаць эканамічны рост, калі разам з пашырэннем і ўскладненнем эканомікі растуць даходы насельніцтва і павышаны попыт адлюстроўваецца ў росце цэн. Гэта, можна сказаць, «здаровая» інфляцыя. Магчыма і супрацьлеглая сітуацыя — стагфляцыя: з-за росту выдаткаў вытворцы (а за імі і прадаўцы) падымаюць цэны, попыт падае, эканамічны рост запавольваецца, а цэны застаюцца высокімі.

— Рост ВУП (попыт, які расце) стымулюе інвестыцыі, бо прадпрыемствы прагназуюць больш высокі прыбытак і пашыраюць вытворчасць. Таму невялікая інфляцыя, якая кантралюецца, нават карысная эканоміцы, паколькі спрыяе яе пашырэнню і паскарэнню, — падагульніла Юлія Абуховіч.

### ШТО ЦЯПЕР АДБЫВАЕЦЦА Ў БЕЛАРУСІ?

— У гэтым годзе за дзевяць месяцаў мы бачым умераны рост ВУП (плюс 1,6 %), які суправаджаецца высокім ростам інвестыцый у асноўны капітал (плюс 15 %, што ўдвая больш за прагнозны паказчык на бягучы год). Гэта сведчыць аб тым, што эканоміка знаходзіцца ў фазе актыўнага інвестыцыйнага попыту, які шмат у чым стымулюецца дзяржавай, — падкрэсліла Юлія Абуховіч.

Пры гэтым інфляцыя выдаткаў (плюс 6,4 %) ніжэйшая за спажывецкую інфляцыю (плюс 7,1 %).

— Гэта значыць, бягучая інфляцыя ў большай ступені з'яўляецца інфляцыяй попыту. А попыт падаграваецца ростам даходаў насельніцтва і вельмі высокім ростам інвестыцый, які цягне за сабой цэны, асабліва ў паслугах і будаўніцтве, — патлумачыла яна. — Пры гэтым індэкс-дэфлятар ВУП склаў за гэты час больш за 12 %, што сведчыць аб росце агульных цэн у эканоміцы амаль удвая хутчэй за рост цэн у спажывецкім кошыку. Тлумачэннем гэтаму можа быць факт, што дэфлятар уключае тое, чаго няма ў індэксе спажывецкіх цэн, а менавіта інвестыцыі і экспарт. Улічваючы каласальны рост інвестыцый у гэтым годзе, цэны менавіта на інвестыцыйныя тавары (будматэрыялы, абсталяванне і г. д.) растуць апераджальнымі тэмпамі. Гэты рост і цягне дэфлятар ВУП уверх, а спажывецкая інфляцыя застаецца пад больш жорсткім кантролем.

Нягледзячы на месячныя ваганні, агульная гадавая інфляцыя працягвае другі месяц запар запавольвацца (з 7,4 % да 7,1 %). Гэта ўказвае на тое, што меры па кантролі цэн і строгая грашова-крэдытная палітыка аказваюць стрымлівальны ўплыў, дадала эксперт.

— Жнівень у Беларусі — месяц сезоннай дэфляцыі (сёлета мінус 0,3 % індэкса спажывецкіх цэн). Адбываецца збор ураджаю, што прыводзіць да адчувальнага зніжэння цэн на агародніну і садавіну, што перавышае сукупны рост цэн на іншыя тавары і паслугі. Зразумела, што гэты фактар з'яўляецца часовым, — адзначыла Юлія Абуховіч. — Ужо ў верасні сезонны фактар вычарпаў сябе, але адначасова з гэтым месячная інфляцыя з боку вытворцаў у апошнія два месяцы таксама была адмоўнай (мінус 0,1 %), што з'яўляецца апераджальным індыкатарам і павінна стрымліваць цэны ў наступны перыяд. Аднак асноўны драйвер інфляцыі цяпер не выдаткі, а ўнутраны попыт у сектары паслуг, а таксама рост цэн на харчовыя тавары, не звязаныя з сезоннасцю, у тым ліку імпартныя (напрыклад, кава).

Пасяховы кантроль росту цэн на гэтыя тавары і паслугі падмацуе намаганні, што прымаюцца кіраўніцтвам краіны па стрымліванні спажывецкай інфляцыі, упэўнена эканаміст.

— Гэта дае падставы чакаць больш нізкага ўзроўню інфляцыі да канца гэтага года, бо два папярэднія гады Беларусь ужо заканчвала з паказчыкам інфляцыі меншым за той, што прагназаваўся, — падсумавала яна.

**Паводле БелТА.**

# ІНІЦЫЯТЫВА ВІТАЕЦЦА

## Значны ўнёсак у развіццё рэгіёнаў робіць ініцыятыва «Адзін раён — адзін праект»

**Да канца года будуць завершаны 90 з 147 бізнес-ідэй, з'явіцца каля 700 новых працоўных месцаў, паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі.**

Тут дадалі, што набірае абароты «Рэгіянальная ініцыятыва», якая стартавала ў гэтым годзе: яе пул дасягнуў адзнакі ў 100 праектаў, ад пяці з якіх у Мінэканомікі чакаюць эканамічнага эфекту ўжо да снежня 2025-га.

Істотную аддачу ў ведамстве прагназуюць ад імпартазамяшчальных і інтэграцыйных інвестпраектаў: 25 з іх таксама завершацца ў 2025-м, высокааплатную работу атрымаюць 355 чалавек.

У цэлым да канца года у Мінэканомікі плануюць завяршэнне 230 з 700 камерцыйных праектаў і стварэнне 2,5 тысячы новых працоўных месцаў.

— Вялікая інвестыцыйная работа будзе і ў 2026-м: звыш 630 праектаў на 10 мільярдаў рублёў, — адзначылі ў ведамстве.









### ДАСЯГНЕННІ Ў 2025 ГОДЗЕ

**>700** інвестпраектаў
у тым ліку **150** новых *(кожны пяты)*

**9,1** млрд рублёў інвестыцый
у тым ліку **0,6** млрд рублёў па новых

**>230** завершацца

**2 500** новых працоўных месцаў

1 **АДЗІН РАЁН — АДЗІН ПРАЕКТ**
147 праектаў
1,6 млрд рублёў
90 завершацца
700 новых працоўных месцаў

2 **ІМПАРТА-ЗАМЯШЧАЛЬНЫЯ**
80 праектаў
0,6 млрд рублёў
20 завершацца
300 новых працоўных месцаў

3 **ІНТЭГРАЦЫЙНЫЯ**
26 праектаў
0,9 млрд рублёў
5 завершацца
55 новых працоўных месцаў

4 **РЭГІЯНАЛЬНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА**
100 праектаў
0,1 млрд рублёў
5 завершацца
50 новых працоўных месцаў



PRO ЭКАНОМІКУ



# АД ЗАМЯШЧЭННЯ ДА АПЯРЭДЖАННЯ



## Беларускай прамысловасці неабходна арыентавацца на прадукцыю новага пакалення

**А ці не занадта мы захапіліся імпартазамяшчэннем? Несумненна, нацыянальная бяспека прадугледжвае ўласную вытворчасць некаторага асартыменту крытычна важнай прадукцыі. Але яе наменклатура, па вялікім рахунку, абмежаваная. Хоць, калі ўключыць буйную фантазію, яе можна пашыраць практычна да бясконцасці. Але ці ёсць у гэтым неабходнасць? Перш за ўсё фінансава-эканамічная. Прычым не столькі з пункту гледжання моманту, колькі доўгатэрміновых перспектыў. Ці не рызыкуем мы трапіць у пастку імпартазамяшчэння, калі будзем марнаваць сродкі і сілы на засваенне вытворчасці існуючай прадукцыі, але не застанецца сіл і рэсурсаў на распрацоўку тавараў будучыні? Той самай інавацыйнай прадукцыі, якая і забяспечвае высокую маржынальнасць і дазваляе ўмацоўвацца на стратэгічных рынках збыту і выходзіць на новыя.**

З пункту гледжання менеджменту, імпартазамяшчэнне — самая простая стратэгія. Нічога звышасаблівага і рабіць не варта. Ёсць прадукцыя з выразнымі і зразумелымі характарыстыкамі. Пастаўшчыкі сыравіны і камплектуючых вядомыя. Ёмістасць рынку і ключавыя крытэрыі канкурэнтаздольнасці відавочныя. Тэхналогіі, у прынцыпе, не з'яўляюцца вялікім сакрэтам. Ніякай асаблівай фантазіі і крэатыву праяўляць не трэба: вырабляй і прадавай. Самая вялікая праблема — не ўпасці ў ілюзію і здолець адгрызці кавалачак рынку ў канкурэнтаў. І не проста іх пасунуць, а яшчэ і забяспечыць годны фінансава-эканамічны вынік, які б надзейна і безумоўна забяспечваў вяртанне інвестыцый.

З апошнім на справе аказваецца нашмат складаней. Устояныя сегменты рынку зразумелыя — у гэтым іх перавагі. З іншага боку, калі сегмент ужо падзелены, у існуючых вытворцаў выбудаваны выразныя вытворчыя і збытавыя ланцужкі, то ўклініцца пачаткоўцу зусім няпроста. Парог уваходу ў такія сегменты досыць высокі з пункту гледжання інвестыцый у маркетынг, рэкламу, збыт, прасоўванне. Пакупнікоў прыйдзецца адваёўваць у канкурэнтаў, прапаноўваць больш цікавыя ўмовы: па цане (тады ніжэйшая маржынальнасць), па якасці (тады расце сабекошт), па больш выгадных умовах суправаджэння тавару (павялічваюцца бягучыя выдаткі). Словам, нават выйграўшы па аб'ёмах продажаў, можна прайграць па грашах, калі суседзі па бізнесе будуць зарабляць больш на адзінцы прадукцыі. А лепшы фінансава-эканамічны вынік заўсёды дае перавагі ў гонцы на рынкавае выжыванне ўдоўгую. На кароткай дыстанцыі можна зрабіць рывок, але на марафонскі забег не хопіць сіл.

Існуе яшчэ адна спецыфіка. Самая высокая рэнтабельнасць у інавацыйных тавараў. Вытворцы першых смартфонаў выдаткавалі істотныя сродкі на іх распрацоўку, але ў першыя гады выхаду на рынку новага гаджэта зараблялі на ім вялікі прыбытак. Калі прадукт стаў масавым і звыклым, то з-за канкурэнцыі значна падае маржынальнасць. І выжыць на рынку ўдаецца не заўсёды нават буйным кампаніям. Нават у такіх безагаворачных лідараў, як Apple і Samsung, узнікаюць пэўныя складанасці. А больш слабыя гульцы ўжо пакінулі або пакідаюць рынак.

Звычайна пасля росту колькасці вытворцаў інавацыйнай прадукцыі наступны этап — кансалідацыя рынку ў руках буйных карпарацый — пераможцаў у жорсткай канкурэнцыі. Тым складаней на ўстояны рынак зайсці новай кампаніі. Асабліва калі вытворчасць даводзіцца арганізоўваць з нуля ці істотна мадэрнізаваць. Гэтыя інвестыцыі трэба акупіць. Добра яшчэ, калі выкарыстоўваюцца ўласныя сродкі. А калі часткова або цалкам пазыковыя, то прыйдзецца яшчэ і плаціць працэнт за карыстанне капіталам. І гэтыя выдаткі пераносяць на сабекошт. Што вельмі балюча, бо дзеючыя прадпрыемствы, як правіла, ужо цалкам амартызавалі свае вытворчыя фонды. Таму ў іх больш нізкі сабекошт па аб'ектыўных прычынах. Адпаведна, і вышэйшая канкурэнтаздольнасць. Асабліва калі на рынку здараюцца нейкія негатыўныя падзеі. Напрыклад, па нейкіх прычынах зніжаюцца кошты. Тады старыя ўдзельнікі рынку застаюцца ў станоўчай зоне, а вось больш маладыя кампаніі сыходзяць у адмоўную рэнтабельнасць. А там і да неплацежаздольнасці недалёка. Уласна кажучы, мы неаднойчы бачылі праекты, якія вельмі ўдала і паспяхова пачыналіся, а праз некалькі гадоў альбо памiралі, альбо патрабавалі для захавання нейкіх дадатковых ільгот ці нават дадатковых фінансавых уліванняў.

Ёсць яшчэ адна рызыка: у прынцыпе наяўнасць попыту ў доўгатэрміновай перспектыве. Імпартазамяшчэнне — гэта паўтарэнне прадукцыі і тавараў, якія знаходзяцца або ў сталай стадыі жыццёвага цыкла, або нават яе заканчэння. І калі сёння гэтую прадукцыю рвуць з рукамі, то не значыць, што гэта будзе працягвацца бясконца доўга. Нельга выключаць, што гадоў праз пяць адбудзецца затаварванне рынкаў. І што тады рабіць з новым абсталяваннем, але пры адсутнасці збыту? Бо інвестыцыйны цыкл патрабуе пэўнага часу. І ёсць рызыка запусціць вытворчасць да шапачнага разбору. Па сваёй неспрактыкаванасці ў канцы 80-х мы ўжо трапілі ў такую пастку ў масавым парадку, калі на звязаныя заходнія крэдыты набылі новае абсталяванне, але для вытворчасці тавараў, якія ўжо сыходзяць у мінулае. Напрыклад, тых жа дываноў. І ў пераважнай большасці выпадкаў гэтыя праекты скончыліся вельмі сумна.

Таму, як бачыцца, імпартазамяшчэнне — не панацэя. Асабліва калі казаць аб устойлівым развіцці і прамысловасці і эканомікі. Зноў жа, калі гаворка не ідзе аб крытычна важнай прадукцыі з пункту гледжання нацыянальнай бяспекі, якую складана набыць. У астатнім жа мэтазгодна арыентавацца на інавацыйныя, перспектыўныя сегменты. Працаваць не на існуючы, а будучы попыт. Рызык таксама нямала, але затое яны кампенсуюцца больш высокай маржынальнасцю. Вядома, гэта не значыць, што неабходна ўсім кінуцца ў стартапы. Ёсць шырокі спектр традыцыйнай для нашай прамысловасці прадукцыі, па якой у нас ёсць пэўныя стратэгічныя рынкі збыту, надзейныя спажыўцы, адпаведны імідж, пэўная канкурэнтаздольнасць. Гэтыя кірункі немэтазгодна кідаць: наадварот, іх неабходна развіваць. Зноў жа, у інавацыйным ключы. Але калі казаць аб новых вытворчасцях, то лагічна арыентавацца на новую прадукцыю і з ёй выходзіць на новыя рынкі збыту.

**Інтэлект ШТУЧНЫ**













# «ПРАЕКТЫ СЭЗ: АД ІДЭІ ДА ВЫТВОРЧАСЦІ»

### Расказваем аб рэзідэнце СЭЗ «Гомель — Ратон» — «Рэчыцадрэў»



**Адным з рэзідэнтаў свабоднай эканамічнай зоны «Гомель — Ратон» з'яўляецца адкрытае акцыянернае таварыства «Рэчыцадрэў». Больш падрабязна аб праекце СЭЗ расказалі ў Мінэканоміцы.**

Прадпрыемства, заснаванае ў 1904 годзе, на сёння з'яўляецца найбуйнейшым сучасным прадпрыемствам поўнага цыкла перапрацоўкі драўніны, якое працуе па самых перадавых тэхналогіях. «Рэчыцадрэў» спецыялізуецца на нарыхтоўцы драўніны і выпуску фанеры клеенай, драўнянастружкавых пліт, ламінаваных ДСП, сінтэтычных смол, ламелей, паліўных брыкет, мэблі для дома і офіса.

Прадпрыемства вырабляе фанеру розных гатункаў таўшчынёй ад 3 да 30 мм з вонкавымі пластамі з бярозы і алешыны. З пылу, атрыманага пры шліфаванні фанеры, вырабляюцца экалагічна чыстыя паліўныя брыкеты. На сёння лакаматывам прадпрыемства з'яўляецца завод ДСП. Попыт на яго прадукцыю пастаянна павялічваецца. Вытворчасць ДСП і ЛДСП забяспечана самым сучасным абсталяваннем, якое ў сукупнасці з высокім прафесіяналізмам і зладжанай работай калектыву дазваляе штогод павялічваць аб'ёмы вытворчасці.

Прадпрыемства паслядоўна пашырае асартымент і павышае якасць прадукцыі, якая выпускаецца, укараняе ў свае вытворчыя працэсы канцэпцыю «беражлівага менеджменту».

Асаблівым попытам як на ўнутраным, так і на знешнім рынках карыстаецца ламініраваная драўняна-стружкавая пліта. Вытворчасць мэблі ў ААТ «Рэчыцадрэў» замыкае поўны цыкл перапрацоўкі драўніны на прадпрыемстве. Аснова асартыменту складае мэбля «эканом» і «эканом плюс класа» для бытавых і офісных памяшканняў.

— Мы пастаянна клапоцімся аб захаванні іміджу надзейнага дзелавога партнёра-вытворцы высакаякаснай прадукцыі, — адзначылі на прадпрыемстве.

Дарэчы, вытворца працуе над пошукам новых партнёраў: актыўна ўдзельнічае ў міжнародных выстаўках, развівае сетку гандлёвых прадстаўніцтваў. Сёння доля экспартных паставак прадпрыемства перавышае 80 %.



ЭКАЛАГІЧНЫ СКЛАДНІК

# ЦВЁРДЫЯ КАМУНАЛЬНЫЯ — У ДРУГАСНЫЯ МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ

## Да 2030 года势 планууецца не менш як 70 працэнтаў адходаў выкарыстоўваць паўторна

Праблема адходаў з'яўляецца адной з найбольш вострых у свеце. Няправільнае абыходжанне з імі прыводзіць да забруджвання навакольнага асяроддзя, пагаршэння якасці вады, паветра, глебы і, як следства, негатыўна адбіваецца на здароўе чалавека. Аб прымаемых дзяржавай мерах і дасягненнях у сферы абыходжання з камунальнымі адходамі расказалі спецыялісты

Аб'ём утварэння цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) у 2024 годзе склаў 4,3 млн тон. З іх вывезена і прынята ад насельніцтва і арганізацый 3,5 млн тон. Нарыхтавана асобна сабраных другасных матэрыяльных рэсурсаў 800 тысяч тон.

Як адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Максім ТАРАСАЎ**, да 2030 года планууецца выкарыстоўваць ЦКА не менш за 70 %. Дасягнуць дадзеных паказчыкаў мяркуецца за кошт прыняцця розных мер: вызначэння адзінага дзяржоргана, які ажыццяўляе рэгуляванне і кантроль у сферы абыходжання з адходамі, выпрацоўкі адзіных падыходаў да абыходжання з адходамі, устанаўлення пераліку відаў прадукцыі, пры вытворчасці якой неабходна выкарыстоўваць другасныя матэрыяльныя рэсурсы (ДМР). Працягнецца ўдасканаленне сістэмы сартавання і захавання ЦКА, мадэрнізацыя кантэйнераў і смеццявозаў і інш.

Шэраг мер ужо рэалізуецца. У прыватнасці падрыхтаваны праект закона, якім уносяцца карэкціроўкі ў сферу абыходжання з адходамі. Прадугледжаны і іншыя заканадаўчыя навацыі, накіраваныя на больш шырокае выкарыстанне ДМР у вытворчасці, кантроль эксплуатацыі палігонаў, прадухіленне несанкцыянаваных звалак. Узмоцнены кантроль у сферы абыходжання з адходамі.

— Па аператыўных даных, за 9 месяцаў 2025 года ў Беларусі сабрана і накіравана на перапрацоўку 691 тысяча тон ДМР. Гадавы план, даведзены да рэгіёнаў і Мінска, выкананы на 71 %, — распавёў **начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксей ФІЛАНОВІЧ**. — У цэлым па краіне больш за ўсё ДМР за гэты перыяд сабрана ў Мінску (164 тысячы тон) і Гомельскай вобласці (103 тысячы тон).




Паводле слоў прадстаўніка Мінжылкамгаса, зараз у краіне функцыянуюць 85 аб'ектаў, прызначаных для сартавання ЦКА і ДМР. Яны дазваляюць сартаваць каля 1,5 млн тон адходаў — 40 % ад аб'ёму вывезеных і прынятых адходаў, якія падлягаюць сартаванню. У Мінску, абласных цэнтрах, Баранавічах, Оршы, Бабруйску і Наваполацку дзейнічае 10 буйных смеццесартавальных комплексаў, у раёнах — 75 ліній па сартаванні.

— На лініях прадугледжана ручное сартаванне з адборам некалькіх фракцый ДМР, асноўныя з якіх — адходы паперы, кардону, шкла, ПЭТ-бутэлькі, поліэтылен, метал, — расказаў Аляксей Філановіч.

Смеццесартавальныя комплексы ў такіх гарадах, як Брэст, Баранавічы, Віцебск аснашчаны сучаснымі аптычнымі сепаратарамі, якія распазнаюць матэрыял па велічыні, форме, структуры, колеры і дазваляюць у паў- і аўтаматычным рэжымах аддзяляць віды ВМР.

Дарэчы, у апошнія гады развіццё магутнасцей для сартавання ЦКА, расказаў спецыяліст, адбывалася па шляху аб'яднання некалькіх раёнаў у адзіную зону са стварэннем у найбольш буйным з іх агульнага смеццесартавальнага комплексу, куды накіроўваюцца ўсе адходы. Цяпер ужо функцыянуюць тры такія рэгіянальныя аб'екты: у Брэсце, Баранавічах і Оршы. Сёлета да іх далучыліся комплексы, створаныя для бабруйскай зоны абслугоўвання і Мінска. Будуюцца такія аб'екты ў Гомелі і Ваўкавыскім раёне, на завяршальнай стадыі будаўніцтва — аб'ект у Наваполацку.

**Александрына ПАРШЫНА.**

# Извещение о проведении 2 декабря 2025 года торгов на право размещения средств рекламы на территории станции Минск-Пассажирский

| № предмета торгов | Место размещения средства рекламы | № места (согласно схеме) | Вид средства рекламы | Количество и размер средства рекламы | Срок действия договора | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. (с учётом НДС) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Минск, главный корпус Северного железнодорожного вокзала (отметка -4,650) | 4-1 | Лайтбокс | 2,50 × 1,25 м – 1 ед. | с 12 декабря 2025 года по 31 декабря 2028 года включительно | 110,00 |
| 2 | г. Минск, главный корпус Северного железнодорожного вокзала (отметка -4,650) | 4-2 | Лайтбокс | 2,50 × 1,25 м – 1 ед. | с 12 декабря 2025 года по 31 декабря 2028 года включительно | 110,00 |
| 3 | г. Минск, главный корпус Северного железнодорожного вокзала (отметка -4,650) | 4-3 | Лайтбокс | 2,50 × 1,25 м – 1 ед. | с 12 декабря 2025 года по 31 декабря 2028 года включительно | 110,00 |
| 4 | г. Минск, главный корпус Северного железнодорожного вокзала (отметка -4,650) | 5-1 | Лайтбокс | 1,50 × 1,25 м – 1 ед. | с 12 декабря 2025 года по 31 декабря 2028 года включительно | 66,00 |

**Материал изготовления средства рекламы**: алюминиевые профили «Магнетик», акриловое стекло с матрицей, защитное оргстекло, неодимовые магниты, по периметру конструкции светодиодная подсветка с температурой светового потока 5000К и мощностью на м.п. 14вт.

***Необходимые условия размещения рекламы:***
- размещать средства рекламы строго в соответствии со схемами;
- передать средства рекламы УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский в безвозмездное пользование на весь срок действия договора по оказанию рекламных услуг;
- не позднее 20 рабочих дней после заключения договора оказания услуг по размещению рекламы разработать проект крепления рекламных конструкций и согласовать с УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский;
- не позднее 3 рабочих дней после заключения договора оказания услуг по размещению рекламы подать заявку на получение технических условий в УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский;
- не позднее 30 календарных дней после получения технических условий разработать проектную документацию на электроснабжение и согласовать в соответствии с требованиями технических условий и законодательством Республики Беларусь;
- не позднее 30 календарных дней после разработки и согласования проектной документации на электроснабжение произвести электромонтажные и пусконаладочные работы с предоставлением пакета документов в ГУ «Государственный энергетический и газовый надзор» для получения разрешения на подключение электроустановок;
- заключить договор на электроснабжение с УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минской дистанцией электроснабжения, копию договора предоставить УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский;
- в течение 10 рабочих дней после заключения договора на электроснабжение с УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минской дистанцией электроснабжения предоставить УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский его копию, а также копии технических условий и акта осмотра ГУ «Государственный энергетический и газовый надзор»

***Условия оплаты услуг по размещению рекламы:***
- цена продажи предмета торгов засчитывается в счет оплаты за оказание рекламных услуг по договору за 1-й месяц размещения;
- условием оплаты услуг по размещению рекламы является предоплата за текущий месяц в размере 100 % в первые 3 рабочих дня текущего месяца;
- стоимость услуг по размещению рекламы, определенная по итогам торгов, действует первые 12 месяцев размещения, в дальнейшем стоимость услуг по размещению рекламы ежегодно пересчитывается путем увеличения на индекс потребительских цен

**Государственное юридическое лицо** – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский, г. Минск, пл. Привокзальная, 3, тел. (017) 225-52-62.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Форма проведения торгов** – аукцион.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».

Аукционные торги проводятся **2 декабря 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Документы на участие в торгах принимаются с 30.10.2025 **по 26.11.2025** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток (задатки) и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах;
- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится по каждому из предметов торгов);
- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа 40901 (назначение платежа – задаток для участия 02.12.2025 в торгах на право размещения средств рекламы по предмету торгов №_).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются:

физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица - оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** обязан:

- возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись;
- перечислить на расчетный счет УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с условиями торгов и договором оказания услуг по размещению рекламы);
- заключить договор оказания услуг по размещению рекламы с УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский (при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефоны для справок:**
отдел аукционов – (017) 360-42-22,
УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский – (017) 225-52-62.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – www.mgcn.by (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский – www.pass.rw.by, Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «Объявления – Аукционы»).

# ПАЛЁТ — НАРМАЛЬНЫ!




## НАМ КРЫЛЫ НЕ ПАДРЭЖАШ

Гісторыя падарожжаў па беларускаму небу пачалася 7 лістапада 1933 года, калі быў адкрыты аэрапорт у Мінску, а з беларускай сталіцы ў Маскву стартаваў першы пасажырскі рэйс. А сёння флагманам галіны па праве лічыцца авіякампанія «Белавія» — найбуйнейшы авіяперавозчык краіны, які базіруецца ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. Кампанія была створана ў 1996 годзе, а з 1997-га з'яўляецца паўнапраўным членам Міжнароднай асацыяцыі паветранага транспарта (IATA). Яна ажыццяўляе рэгулярныя рэйсы ў 12 краін, абслугоўвае 22 аэрапорты.

Нягледзячы на санкцыі, якія мелі на ўвазе і адмену маршрутаў у некаторыя краіны, нацыянальны авіяперавозчык здолеў застацца на плаву, аператыўна памяняўшы карту палётаў. Сёння сярод найбольш запатрабаваных напрамкаў у пасажыраў — Масква, Санкт-Пецярбург, Дубай, Стамбул, Тбілісі і Баку. А пасажырапаток і колькасць рэйсаў у Кітай у параўнанні з 2024-м выраслі практычна ў два разы.

Праз 15 гадоў санкцый, 1 верасня 2025-га Упраўленне па кантролі за замежнымі актывамі ЗША (OFAC) выдала Генеральную ліцэнзію № 11, якая дазваляе правядзенне аперацый з «Белавія». Частковае зняцце абмежаванняў, магчыма, адкрые і новыя магчымасці. Напрыклад, спрашчэнне паставак запчастак і работы з амерыканскай валютай у міжнародных аперацыях.

Галіна бесперапынна ўдасканальвае матэрыяльна-тэхнічную базу, абнаўляе спецтэхніку і асвойвае новыя віды яе рамонту. У сувязі з планамі па пачатку эксплуатацыі далёкамагістральных паветраных суднаў у Нацыянальным аэрапорце Мінск ужо прапрацоўваецца маштабная праграма пашырэння інфраструктуры. Яна ўключае рэканструкцыю аэравакзальнага комплексу і перона, а таксама закупку спецыялізаванай тэхнікі для абслугоўвання двух новых самалётаў — далёкамагістральных. Імі паветраны флот папоўніўся ў канцы мінулага года, і пасля рамонтных работ яны былі гатовы да сваіх рэйсаў. Важна адзначыць, што тэхнічнае абслугоўванне самалётаў, у тым ліку іх афарбоўка, было цалкам праведзена на Мінскім авіяцыйным рамонтным заводзе. А таму і якасць работ — на самым высокім узроўні.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Трэці самалёт, паводле слоў **генеральнага дырэктара «Белавія» Ігара ЧАРГІНЦА,** плануецца ўвесці ў строй да лютага наступнага года. Па даных кампаніі, з пачаткам актыўнай эксплуатацыі другога далёкамагістральнага самалёта ў кастрычніку рэальны рост пасажырапатоку ўжо дасягнуў 11 %.

## ПРЫЯРЫТЭТ — БЯСПЕКА ПАЛЁТАЎ

Сёння развіццю паветраных перавозак у Беларусі дзяржава ўдзяляе пільную ўвагу. Пастаянная мадэрнізацыя аэрапортаў у абласных цэнтрах і здольнасць Нацыянальнага аэрапорта Мінск прымаць любыя тыпы паветраных суднаў — нагляднае таму пацвярджэнне. Дарэчы, аэранавігацыйнае абслугоўванне ў нашай паветранай прасторы прадстаўлена 141 авіякампаніяй з 37 дзяржаў свету, а інтэнсіўнасць палётаў праз тэрыторыю Беларусі ўзрасла на 27 %. Адбылося гэта дзякуючы палётам авіякампаніі такіх краін, як Егіпет (у 52 разы), Кітай (у 1,7 раза) і Казахстан (у 1,6 раза). Ключавым кірункам застаецца цеснае ўзаемадзеянне са стратэгічным партнёрам — Расійскай Федэрацыяй. За апошнія два гады было адкрыта 9 новых напрамкаў, і зараз агульная колькасць маршрутаў у РФ дасягнула 17. Неабходна адзначыць, што Нацыянальны аэрапорт Мінск узаемадзейнічае з 10 авіякампаніямі, большасць якіх — з Расійскай Федэрацыі: «Аэрафлот», «Перамога» і «Red Wings».

Аднак галоўны прыярытэт заўсёды застаецца нязменным — бяспека палётаў. Гэта задача непарыўна звязана з чалавечым фактарам, паколькі залежыць не толькі ад надзейнасці тэхнікі, але і ад найвышэйшага прафесіяналізму ўсіх авіяспецыялістаў. Менавіта дзякуючы іх зладжанай рабоце і стабільнай якасці паслуг беларускія авіятранспартныя прадпрыемствы здолелі заваяваць аўтарытэт на міжнароднай арэне. Важнай падзеяй года стане першы ў гісторыі краіны выпуск лётчыкаў грамадзянскай авіяцыі, падрыхтаваных у Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі сумесна з ДТСАФ і іншымі авіяцыйнымі арганізацыямі краіны. «У складаных знешніх умовах беларуская грамадзянская авіяцыя працягвае дэманстраваць упэўненасць і актыўна развіваецца, адпавядаючы ўсім міжнародным стандартам бяспекі, надзейнасці і якасці авіяперавозак», — адзначыў **Ігар ГОЛУБ, дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый.**

## НОВАЕ ЖЫЦЦЁ РЭГІЯНАЛЬНЫХ АЭРАПОРТАЎ

Як паведаміў **генеральны дырэктар Нацыянальнага аэрапорта Мінск Уладзімір ЧАРАУХІН,** у параўнанні з мінулым годам па ўсіх ключавых паказчыках назіраецца станоўчая дынаміка. Рост дэманструе пасажырапаток, які склаў 102 %. Колькасць самалётавылетаў таксама павялічылася на 3,5 %, а аб'ём грузавых перавозак вырас на цэлых 46 %. Пры гэтым ільвіную долю пасажырапатоку нацыянальнага аэрапорта (больш за 66 %) забяспечвае менавіта «Белавія», што падкрэслівае яе ключавую ролю ў транспартнай сістэме краіны. Але радуе не толькі сталіца: у 2025-м былі адкрыты авіязносіны ў філіяле — ў Магілёўскім аэрапорце, а Аршанскі філіял адзначыўся прыростам у перавозцы грузаў.

Адраджэнне работы рэгіянальных аэрапортаў было адной з ключавых задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы ў галіне. Яшчэ 3—4 гады таму яны практычна бяздзейнічалі, але дзякуючы сумесным намаганням работнікаў авіяцыі сітуацыя змянілася, і рэгулярныя рэйсы ўжо паспяхова функцыянуюць у рэгіёнах: «Першым адначыў палёты аэрапорт Гомеля, затым да яго далучыліся Брэст і Магілёў. Віцебск пакуль працуе па чартэрнай праграме, але ў перспектыве ў нас работа на рэгулярнай аснове і з ім», — падкрэсліў дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый. У планах на наступны год — рамонт узлётна-пасадачнай паласы і абнаўленне радыётэхнічнага абсталявання ў аэрапорце Гродна, каб запусціць рэгулярныя і чартэрныя рэйсы ў гэтым рэгіёне.

**Аміна НАЗАРАВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**





**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **Речицкого РайПО** (продавец) извещает о проведении **11 ноября 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **Лот № 2:** Капитальное строение, инв. № 340/С-3204616 площадью 128,8 кв. м, назначение – Здание специализированное розничной торговли, наименование – Здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324584404101000013 площадью 0,0303 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Защёбьевский с/с, д. Макановичи, ул. Школьная, 101. Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка |
| **Начальная цена** продажи с НДС – 828,00 бел. руб. **Задаток** – 8,28 бел. руб. |
| **Лот № 3:** Капитальное строение инв. № 340/С-3204621 площадью 88,9 кв. м, назначение – Здание специализированное розничной торговли, наименование – Здание магазина № 37, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324585406601000007 площадью 0,0471 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Короватичский с/с, д. Тишковка, ул. Советская, 6. Составные части и принадлежности: пристройка из блоков газосиликатных |
| **Начальная цена** продажи с НДС – 750,00 бел. руб. **Задаток** – 7,50 бел. руб. |

**Продавец: Речицкое РайПО**, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2.
Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 33 643-43-14.
**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**
**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00** до **13.00** и с **14.00** до **17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 10.11.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **30 (тридцати) календарных дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона:**
**+375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

<table>
<tr><td colspan="6">ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Минский завод «Термопласт»</td></tr>
<tr><td colspan="6">Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей</td></tr>
<tr><td>ЛОТ № 1</td><td colspan="5">Изолированное помещение с инв. 500/D-1002997, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Седых, д. 66, пом. 1. Площадь – 1422,0 кв. м. Наименование – Спортивный комплекс, расположенный на 1 и 2 этажах (пристройка к средней школе № 114). Назначение – Помещение физкультурно-оздоровительного и (или) спортивного назначения. Обременение: аренда</td></tr>
<tr><td>Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN</td><td>1 184 400,00</td><td>Задаток, BYN</td><td>118 440,00</td><td>Шаг аукциона</td><td>5 %</td></tr>
<tr><td>Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны</td><td colspan="5">ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ»,<br>Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50.<br>Тел. +375172811340. E-mail: office@oaotermoplast.by</td></tr>
<tr><td>Сведения об организаторе аукциона</td><td colspan="5">ОАО «Н Холдинг»,<br>220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 (Мария)</td></tr>
<tr><td>Срок подписания договора купли-продажи</td><td colspan="5">Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона</td></tr>
<tr><td>Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов</td><td colspan="5">Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона</td></tr>
<tr><td>Условия оплаты</td><td colspan="5">Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) в срок не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона</td></tr>
<tr><td>Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе</td><td colspan="5">Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 17 ноября 2025 года (включительно) в рабочие дни с 09.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1</td></tr>
<tr><td>Место, дата и время проведения аукциона</td><td colspan="5">Открытый аукцион состоится 18 ноября 2025 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»</td></tr>
<tr><td colspan="6">Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения</td></tr>
</table>

ПА ПАЛІЧКАХ

# ПРАВІЛЫ ДОБРАГА ДРОНА

## Як выкарыстоўваць БПЛА і не стаць правапарушальнікам



На мінулым тыдні Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон «Аб змяненні законаў па пытаннях крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці», якія накіраваны на ўзмацненне аховы паветранай прасторы Беларусі. Закон таксама ўстанавіў адказнасць за парушэнне правілаў пастаноўкі і зняцця беспілотніка з дзяржаўнага ўліку. Падрабязней аб усіх тонкасцях захоўвання і выкарыстання БПЛА на тэрыторыі нашай краіны, а таксама аб тым, якое пакаранне прадугледжана за невыкананне правілаў, у Нацыянальным прэс-цэнтры расказалі спецыялісты.

### ЯК ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ І ЎВЕЗЦІ БЕСПІЛОТНІК У БЕЛАРУСЬ?

Новы закон устанавіў адміністрацыйную адказнасць за незаконныя ўвоз, захоўванне, абарот, эксплуатацыю і выраб грамадзянскіх беспілотнікаў. Так, цяпер фізічныя асобы за пералічаныя парушэнні прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу да 30 базавых велічынь з магчымай канфіскацыяй лятальнага апарата. Пры паўторным парушэнні на працягу года — крымінальная адказнасць.

Закон таксама ўстанавіў адказнасць за парушэнне правілаў пастаноўкі і зняцця беспілотніка з дзяржаўнага ўліку, папярэдзіла **начальнік упраўлення прававой, кадравай работы і дакументацыйнага забеспячэння Дэпартамента па авіяцыі Вольга КАЛОШЫЧ.** Яна паведаміла, што для ўвозу беспілотніка ў Беларусь неабходна атрымаць дазвол у Дэпартаменце па авіяцыі. Затым на працягу пяці рабочых дзён з моманту ўвозу трэба паставіць БПЛА на ўлік. Тут новае заканадаўства вылучае дзве катэгорыі арганізацый: тыя, якія рэалізоўваюць беспілотнікі, і тыя, якія іх эксплуатуюць, — тлумачыць Вольга Калошыч: «Арганізацыя, якая рэалізоўвае беспілотнікі, ставіць іх на дзяржаўны ўлік без мэты эксплуатацыі, таму на дадзеным этапе ідэнтыфікацыйныя пазнакі класа і нумары на кожны беспілотнік не ўстанаўліваюцца. Гэтыя маркіроўкі наносяцца пазней, калі беспілотнік паставіць на ўлік арганізацыя, што эксплуатуе».

Падставай для зняцця з уліку можа стаць, напрыклад, разбурэнне беспілотніка. Аб гэтым неабходна паведаміць у Дэпартамент па авіяцыі, прычым зрабіць гэта трэба ў той жа дзень, калі беспілотнік быў разбураны. Дарэчы, сёння на дзяржаўным уліку стаіць каля 1,6 тысячы грамадзянскіх беспілотных лятальных апаратаў. У асноўным яны выкарыстоўваюцца для правядзення аэрафотаздымкі ў сельскай гаспадарцы і пры геолага-геадэзічных работах.

У ліку асноўных парушэнняў, якія дапускаюць уладальнікі грамадзянскіх беспілотнікаў, у Дэпартаменце па авіяцыі назвалі наступныя: эксплуатацыя беспілотніка без нанясення ўнікальнага ўліковага нумара і ідэнтыфікацыйнай пазнакі класа; выкананне палёту аператарам, які не прайшоў падрыхтоўку; перадача кіравання асобе, якая не мае падрыхтоўкі кіравання такой тэхнікай. Усе гэтыя дзеянні цяпер прыроўнены да адміністрацыйных правапарушэнняў.

### ЯК ПАЛЯЦЕЦЬ ЗАКОННА?

Каб законна валодаць і выкарыстоўваць лятальныя апараты ў межах пагранічнай зоны (прыгранiччы), трэба звярнуцца ў найбліжэйшае тэрытарыяльнае падраздзяленне органаў пагранічнай службы, расказаў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення папярэдняга расследавання і прававога забеспячэння аператыўнай дзейнасці Дзяржпагранкамітэта Мікалай БАРЭЙКА.** Для выканання палёту неабходна прадставіць у найбліжэйшае тэрытарыяльнае падраздзяленне органаў пагранічнай службы ўсе неабходныя звесткі, у тым ліку інфармацыю аб тым, хто будзе выкарыстоўваць беспілотнік, яго кантактныя тэлефоны, тып лятальнага апарата, лётныя тэхнічныя характарыстыкі і іншую важную інфармацыю. «Даволі часта выяўляем выпадкі, калі асобы выкарыстоўваюць беспілотныя лятальныя апараты ў розных мэтах, у тым ліку для ажыццяўлення супрацьпраўнай дзейнасці на дзяржаўнай граніцы, ажыццяўлення назірання за аб'ектамі пагранічнай інфраструктуры. Сёлета па такіх фактах мы ў 94 выпадках пачыналі адміністрацыйны працэс, канфіскавалі 81 беспілотны лятальны апарат і камплектуючыя. За парушэнне правілаў пагранічнага рэжыму органамі пагранічнай службы прыцягнуты да адказнасці 33 асобы», — сказаў Мікалай Барэйка.

Адной з асноўных прычын унясення змяненняў у дзеючае заканадаўства сталі шматлікія парушэнні парадку выкарыстання паветранай прасторы Беларусі з ужываннем беспілотных лятальных апаратаў, заявіў **начальнік Галоўнага штаба — першы намеснік камандуючага ВПС і войскамі СПА Сяргей ФРАЛОЎ:** «Гэта галіна развіваецца, колькасць беспілотных апаратаў павялічваецца, і насельніцтва, у тым ліку нашай краіны, імкнецца выкарыстоўваць дадзены тып лятальных апаратаў у сваіх мэтах — асабістых і вытворчых. Змяненні ў дзеючым заканадаўстве накіраваны на ўпарадкаванне дадзенай сферы».



